мира. Предметом отдельных исследований в этом ключе могло бы стать и сознание современных белорусов.

Философское знание, прежде всего в самих западных странах, выделяет различные аспекты европоцентризма, видообразующие для него как идеологии и мировоззренческой позиции. Одна из наиболее глубоких разработок проблемы была предложена И. Валлерстайном [1]. Среди составляющих европоцентризма он выделяет характер историографии, в которой доминирует европоцентристская парадигма исторических и философско-исторических исследований; идеи превосходства Европы в развитии капитализма, техники, рациональной бюрократизации и индивидуальных свобод; претензии на универсализм, под которым в данном случае понимается идея, что существуют непреложные научные истины, источником которых выступает западная наука; позиция единственной или наиболее «цивилизованной цивилизации», которая вобрала в себя наследие не только Средневековья, Древней Греции и Рима, но также и древнего Израиля. Однако главной составляющей европоцентризма остается идея прогресса, которая буквально отождествляется с разнообразными особенностями европейской культуры и навязывается в жесткой связи с ними.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. Wallerstein, Immanuel. Eurocentrism and its Avatars: The Dilemmas of Social Science [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://iwallerstein.com/wp-content/uploads/2024/09/NLREURAV.pdf. – Дата доступа 10.02.2025.

УДК 476.76 “1912/1915”

## ДАМАВАЯ ЦАРКВА ГАРАДЗЕНСКАЙ РЭАЛЬНАЙ ВУЧЭЛЬНІ ІМЯ ЦЭСАРЭВІЧА АЛЯКСІЯ: ДА ГІСТОРЫІ АБСТАЛЯВАННЯ

**Галубовіч В. У.**
УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт”
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Гісторыя аднаго са старэйшых будынкаў “кампусу” ГДАУ, корпуса БТФ, застаецца часткай мінулага ўніверсітэта і горада ў цэлым. Аднак далёка не на ўсе старонкі гісторыі так званага *старога корпуса* ўніверсітэта, а пачаткова будынка былой Гарадзенскай рэальнай вучэльні імя цэсарэвіча Аляксія, звернута належная ўвага. Адной з іх з’яўляецца кароткая гісторыя існавання ў будынку вучэльні дамавой царквы. У наяўных публікацыях сам факт існавання царквы альбо лаканічна згадваецца [1, 2], альбо ігнаруецца ўвогуле [3, 4]. На жаль, нават у спецыяльнай працы пра дамавую царкву звесткі паходзяць толькі з апублікаваных крыніц [5]. Між тым этапы абсталявання дамавой царквы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

дазваляюць аднавіць захаваныя Журналы будаўнічай камісіі вучэльні за 1913-1915 гг. [6].

Калі абапірацца на пратаколы пасяджэнняў будаўнічай камісіі вучэльні, то ўпершыню грунтоўнае абмеркаванне “царкоўнага” пытання адбылося 1 траўня 1912 г. Прапанова звярнуцца да справы абсталявання іканастаса была вынесена ў першы пункт павесткі дня старшынёй пасяджэння Уладзімірам Арэставічам Ліндзерсам, дырэктарам рэальнай вучэльні. На пачатку былі разгледжаны два каштарысы на пабудову іканастаса. Першы, ад мастацкай іканапіснай фірмы (майстэрні) Пашкова з Масквы, другі – ад Краснастоцкага жаночага манастыра, які знаходзіўся ў Гарадзенскай губерні. Каштарыс фірмы Пашкова выглядаў наступным чынам: *“іканастас, шырынёй 12 аршынаў і вышынёй ад салеі з крыжом 7 аршынаў і 4 вяршкі, зроблены з сухога суцэльнага дубу з разьбой, а гладкія часткі – з аклеенага фанерай. З таго ж дрэва кіёты для ахвярніка і запрастольныя іконы, а таксама ўсё неабходнае для алтара; прастол таксама дубовы, а вечка яго – кіпарысавае. Іконы ў іканастасе мастацкага пісьма, на ліпавых дошках, з дубовымі шпонкамі, па залатому чаканнаму ці па фарбаванаму фону, з залатым чаканным шлякам”*. Выраб іканастаса фірма Пашкова гарантавала за год. Фінансавыя дэталі прапановы былі наступныя: за 31 ікону рознай велічыні прасілі 1150 руб., іканастас з двума простымі адчыненымі дубовымі клірасамі, з кіётамі, прастолам і інш., уключаючы ўсталяванне на месцы – 3075 руб. Разам 4225 руб. Перавоз з Масквы ў Гародню павінен быў аплочваць замоўца.

Каштарыс Краснастоцкага манастыра выглядаў так: *“іканастас дубовы з арнаментнымі аздобамі шырынёй 12 аршынаў і вышынёй 5 аршынаў – 1600 рублёў. 12 ікон і запрастольны крыж з пастаментам – 560 рублёў, што давала разам 2160 рублёў”*. Калі да гэтага дадаваліся неабходныя прадметы (клірасы, кіёты і інш., што не згадвалася ў каштарысе), то агульная сума прапановы манастыра вагалася ад 2500 да 2700 руб. Пры гэтым старшыня пасяджэння паведаміў, што раіўся з гарадзенскім епіскапам Міхаілам, які лічыў, што ў дамавой царкве не павінна быць шмат ікон, толькі самыя неабходныя. Зыходзячы з гэтага, найбольш прымальны быў праект Краснастоцкага манастыра, тым больш, што на абсталяванне царквы было вылучана 5000 руб. [6, Арк. Арк. 137 адв.–137 адв.].

Адказны за пабудову вучэльні архітэктар С. Валансевіч падчас пасяджэння выказаў прапанову, каб іканастас быў зроблены не з дрэва, а быў *“мармурова-бетонны”*. Яго аргументацыя (больш лёгкі рамонт, вага, якая не перавышала драўляны выраб) была падтрымана ўсімі сябрамі камісіі, разам са старшынёй. Пасля гэтага адбылося абмеркаванне (падчас якога разглядаліся эскізы фірмы Пашкова і было вырашана, што іконы



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

павінны былі быць напісаны не на палатне, а на ліпавых дошках альбо метале), у выніку якога было пастаноўлена: 1) спісацца з майстэрняй Пашкова, каб высветліць магчымасць вырабу *“мармурова-бетоннага”* алтара; 2) пры згодзе запрасіць самога І. Пашкова наведаць Гародню для канчатковых перамоў; 3) скараціць колькасць ікон, за кошт чаго фірма Пашкова мела набыць усё неабходнае для поўнага абсталявання царквы; 4) іканастас належала зрабіць на працягу года (Краснастоцкі праект за гэты тэрмін, па меркаванні камісіі, нельга было рэалізаваць з-за нястачы майстроў) [6, Арк. 137 адв.–138 адв.].

Наступны раз да пытання абсталявання царквы будаўнічая камісія звярнулася на пасяджэнні 12 чэрвеня 1912 г. Была заслухана прапанова ад фірмы Пашкова, з якой вынікала, што за 5000 руб. уся праца можа быць выканана да 1 верасня 1913 г. Грошы фірме належала пералічыць пяццю часткамі, прычым апошнія 500 руб. праз год пасля здачы аб’екта, каб гарантаваць выпраўленне магчымых недахопаў. Паколькі камісія абрала праект Пашкова, то архітэктару С. Валансевічу далі даручэнне атрымаць у І. Пашкова каштарыс з улікам мармуровага іканастаса і без *“царкоўных рэчаў”*, якія камісія пастанавіла купіць у *“Алавянішнікава”* [6, Арк. 150–150 адв.].

На пасяджэнні 8 жніўня 1912 г. будаўнічая камісія прыняла пастанову, што ў царкве належала пакласці паркетную падлогу, як у калідорах, усіх класах і актавай зале [6, Арк. 174–174 адв.]. Менш чым праз месяц, на пасяджэнні 4 верасня 1912 г., была заслухана тэлеграма ад *“мастака Пашкова”*, які паведамляў, што з-за вялікага аб’ёму працы *“з нагоды Царскіх урачыстацей у Маскве”*, ён не змог выслаць каштарыс мармурова-бетоннага іканастаса, але абяцаў не пазней 8 верасня гэта зрабіць. З-за такой затрымкі камісія палічыла своечасовай ідэю С. Валансевіча, які прапанаваў звярнуцца адносна мармуровага іканастаса да скульптара Вазніцкага з Вільні. Рэалізацыю ідэі даручылі самому С. Валансевічу [6, Арк. 181].

Канчатковы выбар праекта адбыўся 24 кастрычніка 1912 г.: камісія спяшалася зрабіць замову, паколькі выраб і ўсталяванне іканастаса маглі зацягнуцца. Для вырашэння пытання былі разгледжаны два праекты і два каштарысы. Акрамя фірмы Пашкова, свой праект паспеў зрабіць скульптар-каталік Вазніцкі. Праекты былі вельмі “тоесныя”. Без уліку царкоўных рэчаў маскоўскі праект каштаваў 3250 руб., а віленскі – 3808 руб. 20 кап. Камісія абодва каштарысы палічыла дарагімі, таму з улікам вылучаных 5000 руб. на ўсю царкву, прыйшлося адмовіцца ад мармуровага (са штучнага каменю) іканастаса. Мінусам прапановы Вазніцкага было тое, што за *“кожную ікону ён бярэ лішніх 15-20 рублёў у выглядзе заробку”*. У выніку камісія абрала праект фірмы Пашкова і пагадзілася на заключэнне з ім кантракта на выраб драўлянага іканастаса



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТАУ

па ўжо раней прапанаваным праекце, а таксама на выраб прастола, ахвярніка, клірасаў, ікон і інш. Агульная сума замовы з улікам 300 руб. на дастаўку і ўстаноўку дасягала 4155 руб. срэбрам, а з улікам 10 % зніжкі фінальная цана была 3700 руб. Разам гэта сума расклалася на 17 пунктаў выдаткаў. Іканастас каштаваў 2000 руб. Было замоўлена 26 ікон: сярод іх 6 мясцовых ікон (Збавіцель, Багародзіца, Архангелы Міхаіл і Гаўрыіл, св. кн. Уладзімір, св. Аляксій Мітрапаліт Маскоўскі) – 650 руб.; 6 ікон на Святы (Раджджаство Хрыстова, Хрышчэнне, Праабражэнне Гасподняе, Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы, Увядзенне ў храм і Успенне Прасвятой Багародзіцы) па 40 руб. – 240 рублёў; ікона *“Тайная вячэра”* каштавала 40 руб.; ікона *“Гасподзь Саваоф са Святым Духам”* – 40 руб.; ікона да ахвярніка *“Маленне аб чашы”* – 75 руб.; самай дарагой была запрастольная ікона *“Уваскрасенне Хрыстова”* – 125 руб. У каштарыс увайшлі два драўляныя клірасы (100 руб.), драўляны аналой (15 руб.), дубовы прастол (вечка кіпарысавае) і ахвярнік, плашчаніца аксамітная (150 руб.), грабніца для плашчаніцы – 100 руб. [6, Арк. 206–207 адв.].

Асобныя пытанні пабудовы і абсталявання царквы ўздымаліся на пасяджэннях будкамісіі ў першай палове 1913 г.: перабудова хораў, столі, дзвярэй [6, Арк. 251–251 адв., 253–253 адв., 256–256 адв., 262]. 15 траўня 1913 г. было абмеркавана пытанне аб усталяванні крыжа і пастаноўлена: *“крыж над царквой зрабіць з таўровых бэлек ... з пазалотай “па мардану”* [6, Арк. 270]. Пазней камісія вырашыла жалезны крыж (з медзяным шарам каля падножжа) усталяваць на фасадзе вучэльні [6, Арк. 285 адв.–286]. Крыж над царквой, гатовы да 7 кастрычніка 1913 г. [6, Арк. 303], даволі добра праглядаецца на фотаздымках вучэльні.

13 жніўня 1913 г. камісія абмеркавала і вырашыла, куды патраціць рэшту ад бюджэту на абсталяванне царквы, якая склала 1260 рублёў (5000-3740 руб.). Царкоўныя рэчы замовілі ў фірмы братоў Алавянішнікавых. Таксама высветлілася, што старшыня камісіі У. А. Ліндэрс падчас паездкі ў Маскву зрабіў выбар царкоўных рэчаў, а іх здымкі былі адасланыя ў Гародню. У выніку пастанавілі замовіць самае неабходнае: 1) панікадзіла; 2) сямісвечнік за прастол; 3) два падсвечнікі перад іконамі; 4) два вынасных падсвечнікі; 5) шандал на ахвярнік; 6) лампаду для горнай іконы; 7) каўчэг; 8) пасудзіны (пацір, дыскас, звяздзіца, лжыца); 9) блюда вынасное; 10) святочнае аблачэнне на прастол і ахвярнік [6, Арк. 291–294 адв.].

Неўзабаве, г.зн. 7 верасня 1913 г., будкамісія абмеркавала прапанову старшыні аб пералічэнні фірме Пашкова 2000 руб., паколькі ў той дзень быў падпісаны акт прыёмкі іканастаса, які *“ужо ставяць на месца”* у вучэльні [6, Арк. 296–297 адв.]. 29 верасня 1913 г. будкамісія выслухала заяву І. Пашкова аб выплаце яму 1500 руб. за працу. У выніку было пастаноўлена пералічыць грошы за ўсталяванне іканастаса, за іконы,

РЕПОЗИТОРИЙ ГрГУ

прастол, ахвярнік, плашчаніцу і грабніцу. Пратакол гэтага пасяджэння засведчыў, што з алтарнай часткі царквы быў уваход у клас Закону Божага [6, Арк. 306–308 адв.].

Усталяванне іканастаса стала нагодай для асвячэння царквы, якое адбылося 31 кастрычніка 1913 г. [1]. Паколькі царква была асвечана ў гонар маскоўскага мітрапаліта Аляксія, то ў дзень яго памяці (12 лютага) вучні вызваляліся ад ранішніх заняткаў для прысутнасці на літургіі і малебне [7, Арк. 16]. У другой палове 1913/1914 навучальнага года ў царкву быў пераведзены хор вучэльні [8, Арк. 57 адв.].

Аднак справа абсталявання на гэтым не спынілася. Толькі 31 лістапада 1913 г. камісія прыняла рашэнне аб разліках з фірмай Алавянішнікава. У выніку пастанавілі выплаціць: 1) за панікадзіла ў візантыйскім стылі пазалочанае ў адзін ярус на 16 свечак – 225 руб.; 2) за сямісвечнік у тым жа стылі залачоны – 120 руб.; 3) за святочнае аблачэнне прастола і ахвярніка – 210 руб.; 4) за пасудзіны срэбныя 84-й пробы (пацір, дыскас, звяздзіца) – 138 руб. 50 кап.; 5) за каўчэг срэбны 84 пробы – 148 руб. 50 кап. Разам – 842 руб. [6, Арк. 309 адв.].

Паводле пастановы камісіі 4 сакавіка 1914 г., на абсталяванне дамавой царквы пайшло 4983 руб. 92 кап., што склала нязначную частку агульнага кошту будоўлі вычэльні – 207 651 руб. 43 кап. [6, Арк. 316–317 адв.]. Але ў справаздачнай ведамасці ад 28 траўня 1914 г., дзе былі рэзюмаваныя выдаткі на царкву і абсталяванне, вынік быў іншы – 5377 руб. і 42 кап. [6, Арк. 332].

Будаўнічая камісія на чале з У. А. Ліндарсам справу абсталявання царквы зацягнула да 1915 г. Усю зіму 1914/1915 гг. у вучылішчы размяшчаўся *“полевой лазарет”*. Хаця праверка становішча будынка была немагчымай, камісія 4 красавіка 1915 г. канстатавала, што *“ўсталяванне іканастаса, алтара і кліра саў выканана ў адпаведнасці з заключаным кантрактам”*, таму фірме Пашкова было пастаноўлена выплаціць 240 руб., пакінутых у якасці залогу [6, Арк. 326–326 адв.].

**ЛІТАРАТУРА**

1. Рябухина, И. В. реальном училище изучали космографию, но готовили вполне земных специалистов / И. В. Рябухина // Гродзенская праўда. – 1998. – № 102 (13418). – 1 верасня. – С. 3.
2. Радзюк, А. Р. З гісторыі будынка Гродзенскага рэальнага вучылішча / А. Р. Радзюк, В. У. Галубовіч // Современные технологии сельскохозяйственного производства: сборник научных статей по материалам XXIII международной научно-практической конференции. – Гродно: ГГАУ, 2020. – С. 333-335.
3. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад. В. Я. Абламскі, І. М. Чарняўскі, Ю. А. Барысюк. – Мінск: БЕЛТА, 2009. – 684 с.
4. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня-Wrocław: Wrocławska Drukarnia Naukowa PAN im. Kulczyńskiego Sp. z o.o., 2012. – 370 с.
5. Гродненское реальное училище имени Цесаревича Алексия и его домовая Свято-Алексиевская церковь / Антоний, Архиепископ Гродненский и Волковысский // https://orthos.org.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

6. НГАБ у Гародні. Ф. 41. В. 1. Спр. 28.
7. НГАБ у Гародні. Ф. 41. В. 1. Спр. 4.
8. НГАБ у Гародні. Ф. 41. В. 1. Спр. 5.

УДК 357. 23 (091) “1903/1917” (476.76)

# СЛУЖБОВЫЯ СТУПЕНІ ГАРАДЗЕНСКАГА ГУБЕРНСКАГА АГРАНОМА ПАЎЛА МІНКОВА (ДА 1917 Г.)

**Галубовіч В. У.**
УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт”
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Сярод асоб, якія на пачатку ХХ ст. актыўна працавалі на ніве паляпшэння сельскагаспадарчай культуры Гарадзеншчыны, пачэснае месца займае Павел Фёдаравіч Мінкоў, гарадзенскі Губернскі аграном у 1911-1915 гг. У адрозненне ад свайго знакамітага бацькі Тодара, паўнавартаснай біяграфіі П. Мінкоў пакуль не атрымаў. Пэўны аб’ём інфармацыі можна знайсці ў вікіпедычнай публікацыі, якая ўтрымлівае ўрыўкавыя і памылковыя звесткі, якія, у сваю чаргу, паходзяць з размешчаных у інтэрнэце крыніц [1]. Між тым архіўныя матэрыялы дазваляюць дадаць шмат невядомых дэталяў і ўдакладненняў да біяграфіі П. Мінкова. Прадстаўленыя у дадзеным артыкуле даныя ўзяты з асабістай справы П. Мінкова, якая захавалася ў архіве Гарадзенскай губернскай землеўпарадкавальнай камісіі (ГГЗК). Гэта справа дазваляе прасачыць этапы жыцця П. Мінкова да 1915 г. [2].

У даволі падрабязных “Фармулярных спісах”, якія захаваліся ў асабістай справе П. Мінкова, змешчана інфармацыя як службовага, так і асабістага характару. Нарадзіўся П. Мінкоў 17 (29) снежня 1873 г. Ён адносіўся да патомных дваран Херсонскай губерні, дзе меў радавы маёнтак Астапаўка (921 дзесяціна). У Кобрынскім павеце Гарадзенскай губерні П. Мінкову належалі маёнткі Горлавічы (339 дзесяцін) і Стэфанты (360 дзесяцін), якія адносіліся да так званай набытай уласнасці – *“благоприобретённые”*. Сямейнае становішча П. Мінкова выглядала так – жанаты з Аляксандрай Мікалаеўнай Хаблоўскай (дачкой стацкага саветніка), з якой меў дачку Вольгу, народжаную 1 лістапада 1901 г. Маёнтка за жонкай не было. Па веравызнанні П. Мінкоў, яго жонка і дачка былі праваслаўнымі [2, Арк. 26 адв.–27]. Цікава, што нідзе ў матэрыялах справы не згадваецца нацыянальнасць П. Мінкова – балгарын.

У “Фармулярных спісах” П. Мінкова адзначалася, што ён скончыў *“курс навук”* у Мікалаеўскай рэальнай вучэльні і здаў іспыт за *“курс дадатковага класа”* ў Пінскай рэальнай вучэльні. Пасля гэтага П. Мінкоў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ